Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—звана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасылаемые рукапісы і карэспондэнцыі.

БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаўкай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб.
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 76. Менск. Чацьвер 27 чэрвеня 1918 г. Год I

Менск 27/VI.

Палітычныя перспэктывы.

Скора стукне 4 гады вайны. На захаднім фронце ідуць моцныя бoi. Увесь сьвет зацікаўлен: калі усе гэта скончыцца? Астатнія моманты могуць мяняць і усю палітычную сітуацыю у Эуропе і на Усходзе. Нейкія зьмены ужо чуюцца у паветры. Перамена у Вялікарасіі большэвіцкаго ураду на консэрвацыйны, рэакцыйны саусім мажліва.

Падганяюць гэту справу так званыя «чэхо-словакі», у радах каторых много афіцэроу і салдат сыбірскіх і расійскіх, каторыя большэвікоу лічуць адзінымі ворагамі Расіі. Яны «камісароу» разстрэліваюць, дзе займуць горад. Ад Дона на большэвізію насядаець генэрал Красноу с гэрманцамі. У Сыбіры дырыжыруець Амэрыка с саюзнікамі і чэхо-славакам паддаюць духу.

Маскоуская абласьць цэнтр прамысловасьці і большэвіцкай палітыкі. Яна жывець прывозным хлебам, і цяпер галадуе. Хто займець гэты цэнтр першы той і зробіць правіцельство с сваей арыентацыей. У Маскве абывацельшчына будзець маліцца таму Богу, каторы скіне з іх татарскае ярмо большэвізма. Цяпер Масква, Смаленск, Арол, Курск «больш гэрманофільскія», як Менск. Калі «чэхо-словакі» дабяруцца да Масквы, там будзе тагды ужо другое паветро.

Стары расійскі імпэрыялізм.

Пазбудзеныя рэспублікі Каўказ, Сыбір, Беларусь, Балтыка усе агламаюць аб нізалежнасьці. Гэта інстынкт самаахраны ад імпэрыялізму старого навейшаго,—большэвіцкаго. Рэакцыянэры усіх гатункоу гарочаць, што вернецца ізноу імпэрыя і імпэрыялізм.

На гэта надзеі ніякой німа: краевыя і нацыянальныя інстынкты, прыдушэнныя жалезам і нагайкай, у часе вайны і рэволюцыі настолькі адрасьлі і скрышталізаваліся, што каб іх зьнішчожыць, трэба многа гадоу імпэрыялістычнай рэакцыі і энэргіі, і яна усе такі дасьць адваротны рэзультат. Краевае і нацыянальнае самапачуцце будзе ад гэтай барацьбы iшчэ больш узрастаць. Самае вялікае ад гэтаго будзе, дык хіба паніжэнне культуры. Уваскрэшэнне старой Расіі цяпер ужо понсэнс.

Ясная рэч, што паміж новымі нізалежнымі дзержавамі будуць урэгуліраваны эканамічныя зьвязкі і так сама палітычныя. Абсолютная ізоляцыя кожнай дзержавы—абсурд. Адмена діфэрэнцыяльнаго тарыфу, гэтай унутранной таможеннай палітыкі, і на нікаторыя прамышленныя цэнтры як Масква, Пецярбург зробіць там прамысловую дэградацыю, але за тое індустрыя разсеецца па мейсцам; мейсцовыя прадуктовыя сілы лепш будуць выкарыстаны.

Замест цяперашней варварскай прамысловасьці будзе эуропэйская капіталізацыя.

Беларусь, Літва, Польшча будуць пад большым ці меншым уплывам Цэнтральных дзержау-эканомічным і палітычным. У нас культура народу больш ужо пахнець Захадам, як гдзе нібудзь у Саратаве. Немцы нашыя старыя знаемыя ішчэ с часоу Вялікаго княжства Літоускаго. Наш народ натуральна будзе чэрпаць высокую культуру с Захаду, адкуль прыдуць да нас і капіталы, каторыя асушаць нашыя безграпічныя абшары балот і ажывяць кровеносными экономічнымі артэрыямі—жалезнымі дарогамі наш край. Беларускі народ і цяпер самы спакойны і дісціпліірованы, аграрную рэвалюцыю углубляла большэвіцкая армія, с выходам каторай селянін узяўся за саху. У восень будзе рэалізован новаэроблены капітал —наш ураджай. Народ працуець нормальна, а арганізацыя края затрымалася—Смаленск, крайні пункт нашай земляробнай абласьці адорван, як і Вітэбск. Беларуская душа баліць, шукаючы нашых праудзівых прыяцеляу і дабрадзееу.

А. У.

Агульныя весткі.

БЭРЛІН, 23/VI. Новыя усьпехі субмарын у блокаднай сфэры каля Англіі: 16,500 бр. тонн. Каля ўсходняго ўзбярэжжа Англіі выбіты сільна абароненых канвоем два караблі.

Начальнік марскога штабу.

БУЭНОС, 23/VI. У Буэнос—Айрэсі і шмат другіх мейсцах, дзе да гэтаго часу ні ведалі што такое сьнег, сягоння па палудні пачаў падаць сільны сьнег. Гэта у першы раз, каб тут бачылі белыя дахі і дрэвы. Так—сама з Родарыо і другіх мест ёсьць весткі аб сільным выпадзе сьнегу.

БЭРН, 22/VI. Згодна газ. «Дэйлі Экспрэсс», вядомыя ўрадныя чыноўнікі іпастраннаго роду, па загаду Ллёйда-Джоржа, спыняны ад пасад.

ГААГА, 21/VI. Згодна дэпэшам с паўднёвай Афрыкі Бото апублікаваў праклямацыю у каторай ён апавешчае, што напалі на сьлед тайных рэспубліканскіх сходак. Ужо 8000 чалавек прысягаліся за маўклівасьць падобных параяў. Генэрал Гертцог, кіраўнік нацыяналістаў, адкрыта процiў руху і ён забараняе ужыванне свайго імяні у зьвязі з гэтым рухом.

КАПЭНГАГА, 22/VI. Мерапрыяцці дзержаў Згоды процiў Ісляндзіі, згодна каторым уся выроба шэрсьці, ўключаючы і прададзенную ужо часьць Даніі, павінны быць прэдастаўлены у карысьць дзержаў Згоды, выклікало вялікую завіруху у Даніі і Швэцыі. Расправы, як паказывае пiвэдская газ. «Ніа Дагліст Аллеганда», былі такія: Раней усяго Ісляндскі урад быў прымушаны вымагаць ад альтынга поўнамоцтва дзеля конфіскацыі чужого мення у Ісляндзіі, што раўняецца нарушэнню сувэрэнных праў Даніі. Пасьля гэтаго Ісляндзкі урад быў прымушаны за вядомую цану прадаць гэтыя пiзаконна канфіскованыя тавары. Якія сілы пабудзілі наогул карыстаючых добрай рэпутацыяй Ісляндцаў да такіх махінацый, аб гэтым німа што казаць, дзеля таго што кожны ведае, наскольні пусто пытанне аб маленькіх дзержавах.

АМСТЭРДАМ, 22/VI. У Віндзоры (Онтарыо) канадскай паліцыяй арэштаваны кіраўнік рабочых, Джон Пэрхуд, абвінавачаны у тым, што ён агітаваў жыхароў сумежных вобласьцей процiў занісі па ваенную службу. У яго быццым знайшлі парыкі, фальшывыя барады і вусы, зьнімкі з важных канадзкіх жалезных дарог і дзьве маленькія бомбы.

ЛЕНДАН, 22/VI. Згодна газ. «Дэйлі Мэйль», кітайскі прэмьер—міністр, Пуан Чы Гэн, вось як выказаўся у адпэй гутарцы: Каля граніцы і у Харбіне стаяць кітайскія войскі дзеля садзействія з японцамі. Калі трэба будзе, то будзе паслано ішчэ больш войск. Мы ні хочам мець большэвікоў у Кітаі.

БЭРЛІН, 14/VI. Ад 1848 году учэрашняя нядзеля была самым халодным днём у чэрвені. Сільны штурм нарабіў шмат шкод. З другіх часьцей краю паведамляюць аб сьнежных бурах. У Брокені сьнег даходзіць аднаго футу вышыны.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ, 24/VI. У суботу армянская дэлегацыя даведывалася гэрманскаго пасла.

БЭРЛІН, 24/VI. Як паведамляе газ. «Бэрлінэр Тагеблат», 14 еўрэйскіх дэлегатаў адпраўляюцца у хуткім часе у Константынополь, каб там абгаварыць разам с турэцкім урадам пытанне аб заселенні Палестыны еўрэямі.

Весткі з Расіі.

Атказ Англіі і коаліцыі на ноты Чычэрына.

Газэта «Наше Слово» ад 19 чэрвеня піша аб нотах камісара ўнешніх спраў Вялікарасіі паданых іх 12 гм.:

«Усім памятны нідаўнiя ноты, якія Чычэрын атправіў хаурусьнікам. Адна датычэла чэхо-словакоў, другая—ваенных караблёў у паўночных гаванях. Фармальна атказаў на ноты ішчэ німа, але суць гэтых атказаў ужо ведама. Чычэрын выказываў надзею, што хаўрусныя дзержавы прызнаюць «патрэбнасьць паўзятых савецкім урадам процiў мяцежнікаў (чэхо-словакоў) спосабаў» і «ні забавяцца выказаць асуджэнне чэхо-словацкім аддзелам». Надзея ні спраўдзілася. Бальфур у лісьце да сэкрэтара чэхо-словацкай нацыянальнай рады прызнае чэхо-словацкую армію як ваенную сілу, баронячую справы хаўрусьнікаў. Ясно, якія адсюль можна зрабіць высноўкі аб судзьбе чэхо - славацкаго фронту»...

«На днях Чычэрын» зьвярнуў сер'ёзную увагу вялікабрытанскаго ураду на нiмагчымасьць далейшаго прабывання ангельскіх ваенных караблёў нават у нівялікай лічбе у гаванях савецкай Рэспублікі», а «так сама» выказаў надзею, што французскі урад ні забавіцца адазваць знаходўячыйся у Ледавітым акіяне каля берагоў Расіі ваенны карабель». Але і гэта надзея ашукала галаву расійскай дыплёматыі. Па весткам »Iurnal de Russie», адказ на ноту Чычэрына будзе уложаны у тоне рашучай нізгоды задаволіць запатрэбаванне савецкаго ураду. Хаўрусьнікі пакажуць, што яны павінны трымаць у паўночных водах свае караблі, каб забезпэчыць ліквідацыю і атпраўку таго лічнаго складу і ваенных прыпасаў, якія імі былі высланы у Расію да заключэння Берасьцейскаго міру».

Як большэвікі наступалі на Таганрог.

Раненыя чырвонагвардзейцы расказалі, што іх было у Ейску 700 чалавек, але правадыры зрабілі прымусовую мобілізацыю па сёлах і сабралі такім чынам аддзел у 12.000 чалав. Вядучы армію на Таганрог, большэвікі угаварылі ей, што тамака ні болі 700 чал. немцаў. што ген. Брусілоў разам з Марусей Нікіфоровой парушылі на немцаў 2-х мільённую армію, што

Чародная выдача прадуктау па бонам—1 ф. цукру, 1 пудэлка сернічак, 1 ф. солі і ½ ф. сушанай агародніны пачата учора, г. з. 25 чэрвеня.

Падвоз у места нікаторых прадуктау,—малака, яек і сырау—у рыначныя дні мала-памалу павялічываецца.

У хуткім часе дастауляецца вялікая партыя селедцоу с Кіева.

——

Арэндкае пытанне. Сярод арэндатарау на землях землеуласьніка Ваньковіча (Комароука) разасланы павядомасьці, за подпісью павераннаго Паніквіцкаго, дзе прапануецца у вельмі кароткі срок унесьці запушчаную за час вайны нідаімку, у праціуным выпадку процiу нідаімшчыкау (каля 200) пачнуцца іскі а скасаванні умовау, зносе дамоу і выселенні.

Тымі жа рэпрэсіямі пужае кантора архіерэйскаго дома (арэндатароу да 500), катэдральны сабор і інш.

Арэндатары шукаюць абароны у кансультацыях па аказанню юрыдычнай помачы насяленню.

——

Епархіяльнай уладай у хуткім часе, на грунце адказу па запытанню на імя кладбішчэнскай перэспенскай цэркві, найболей багатай па скарбоначных даходах, прапануецца павялічэнне істнуючаго пры ей прычта, якому цяжка спрауляцца са многімі пагрэбальнымі трэбамі.

Апрача таго, лічудь вельмі патрэбнай, с прычын жалоб парахвіян, строгую рэглямэнтацыю пахароннай таксы, вельмі павялічанай за апошні час (за адны провады з дому у цэркау 60—100 руб.).

——

Цэнтральныя рабочыя бюро дзеля падачы безработным добрых заработкау у сельскай гаспадарцы і прамысловасьці Гэрманіі адчынены у пяці местах—Менску, Барысаве, Оршы, Бабруйску і Барановічах.

——

У жаноцкай міністэрскай гімназіі законавучыцель Праваслаунай рэлігіі Маслов пазваляе сабе «укорять» нікаторых вучэніц за учасьце у беларускім руху.

Яшчэ ні вывеліся «свои человѣки» быушаго епіскапа—палітыкі Мітрофана — пара ужо, дауно пара!

——

Беларускі хор пад кірауніцтвам Цераускаго за богаслужэннем у мужскім манастыру у Духоу дзень, г. з. 24 чэрвеня, пець адмовіуся. дзеля прапанаванай яму вельмі скупой платы.

——

Забарона увоза ад 22 чэрвеня распараджэннем градоначальніка Гэршэля разшыраецца на рагатую жывелу, сьвіней целят, авечак, мясо, сало, вэндліну, каубасу, зернавыя хлебы, муку, крупу, картопель, соль і стручкавыя: бобы, гарох, чэчавіцу, рыж і саго.

Забарона вывоза глаунае тычыцца гэрбаты, кавы, какао і дражджэй.

——

У мешчанскай управе ліквідацыя справау амаль спынілася.

Заправілы, замест падгатоукі да пераходу управы да меськаго самаупраулення, лічуць болей патрэбным «сядзець» на сваіх мейсцах.

——

Т-во патрэбіцелей «Экономія» грунтуецца пры афіцэрскім бюро. Камісія пры Т-ве, устава якога пацьверджэная пачала сваю працу 20 чэрвеня.

Запісь у члены і паевыя узносы (15 р. і 3 руб. уступного) робіцца ад 23 чэрвеня.

Азначанае патрэбіцельскае Т-во заменіць істнуючае эканамічна афіцэрскае Т-во, намечанае да ліквідацыі.

——

Аднауленне інстытута міравых судзей у губэрні па назначэнню—пытанне, па упорным слухам, некалькіх дзен.

Пры гэтым міравыя судзьзі будуць усе з юрыдычным выкшталцэннем.

АБ УСІМ.

Вільня—места штукарства.

(*С „Петроградскаго Эхо» № 56* ад 27/VI—1918 г.).

Пад такім тытулам зьявілася підаўна у „Вільні пекнае выданне, кніга прыват - доцэнта Вэбэра.

Кніга гэта атрымана підаўна расійскай Акадэміяй Навук і задзівіла як малым коштам так і зграбнасьцю выдання.

Кніга дае шмат аўтатыпаў і зьнімкаў нямецкіх фатографаў. Асобае мейсцо займаюць у кнізі старыя віленскія цэркві, глаўнае жэ узбудаваная у готыцкім стылю Бэрнардынская цэркаў.

Пасьля прагляду гэтай высока—цікавай кнігі прыходзіцца констатыроваць, што намі у праціг дзэсяцілецціяў ні зроблено і дзесятай долі таго, што зрабілі немцы у вобласьці штудивання літоўскай старасьвеччыны за два годы. З абвесткі прыложанай да кнігі відаць што тое самае выдавецтво у хуткім часе мае выпусьціць падобныя апісанні і другіх занятых немцамі мейсц.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 24 чэрвеня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Становішчо без перамен. На р. Анкр і Авр баевая дзеяльнасьць была ўвесь дзень павышанай. Вечарам яна ажывілася так сама і на другіх вучастках фронта. У праціг ночы усілевая разведачная дзеяльнасьць. Усходней Бадонвіллера штурмавыя атрады уварваліся у амэрыканско-французкія акопы, панесьлі ворагу вялікі урон і захапілі 40 палонных.

Лейтэнант Удэт атрымаў сваі 31 і 32, обэр-лейтэнант Герынг сваі 20 і 21 перамогу у паветры.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар фон-Людэндорф.

——

Бібліографія.

——

„Вольная Беларусь“ ,№ 22—23 вышоу з друку 23-го чэрвеня 1918 г. Зьмест такі: Рабочы стан пануючых і прыгвалчаных нацый, стацця Я. Л-к; Выстаука «Вільня-Менск»; Прыфронтавы рубеж на Беларусі, нататкі і уражэнні З. Бядуля; Зіма, апаведанне М. Гарэцкаго; «Нюра», разказ Дзеда; Хроніка і др.

Цана асобнаго №—30 кап.

——

БЕЛАРУСКАЯ ГРАММАТЫКА.

Як нам ведама, грамматыка нашага маладога філолога Б. Тарашкевіча пачата ужо друкам у Петраградзі. Састауленая пад рукаводствам такіх знауцау беларускай мовы, як акадэмік А. Шахматоу і акадэмік Карскі, яна есьць найлепшай с пробау беларускай грамматыкі калі нібудзь робленых. Ні йменне у Менску ці другіх местах Беларусі патрэбных друкарскіх знакау змусіло аутара аддаць яе для друку у Петраград. Сэкрэтарству Асьветы трэба будзе ужыць заходау каб дастаць адтуль патрэбную для школ і саманавучання гэтую кнігу у магчыма большай колькасьці.

Рэдактар **А. Прушынскі**.

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

На рэках Вавілону.

(Успамінкі уцекача).

Клікала я прыяцеляу маіх,—
Яны ашукалі мяне».

(Плач Ерэміі, I 19).

IV*).

Натуральна, што даючы «свой» хлеб «сваім» людзям, дзеячы польскіх і расійскіх камітэтаў стараліся абгладзіць, дапасаваць да сваіх патрэб, зрабіць больш сваймі уцекачоў беларусаў і гаратліва узяліся падкормліваць іх сваім патрыотызмам у дадатак да хлеба. З'яўлялася лішні раз і можа найлепшая прамажнасьць па свайму заапекавацца над гэтымі непрычэсанымі па іхняму «сваімі» людзьмі і яны гэтай прамажнасьці ні абмінулі, а выкарысталі як найлепей.

Хто кемпейшым і спрытнейшым аказаўся пры гэтым, трудна рашыць. Здаецца аднак, што роўна здольнымі былі і расійцы і палякі. Пры гэтым зазначыць трэба, што расійцы у руссыфікацыі аказалі спрытнейшымі у сябе дома, чым будучы у нас. Тамака можна сказаць яны развярнуліся ў ва ўсю шыр. Школы, бурсы, кнігі, уплыў духавенства, гутаркі пры афіцыяльных зносінах з уцекачамі—усё было пушчано у рух. Як-жа,—надавалася «счастливая возможность» зглынуць у «русскоморѣ» беларускую крупіцу, ці-ж можна было яе абмінуць?

Палякі ні адставалі у гэтым ад сваіх „не—прыяцеляў. Ды й ні дзіво, бо для чаго, а для дэнацыяналізацыі так ці іначэй зьвязаных з імі народаў у іх ёсьць свая, старэйшая за рускую мэтода, свая школа. Гэтыя найбольшую увагу зьвярнулі на маладыя пакаленні, бачучы у іх тую сілу, якая возьме жыцце у свае рукі ў підалёкі час. Старыя беларускія «хлопы» ні так былі цікавы для іх тым болей, што праз дзяцей найлягчэй перамяніць і бацькоў. Асабліва карыснымі для гэтай мэты аказаліся бурсы паадчыняныя імі для моладзі. У гэтых бурсах маладыя душы моцна зашнуроўваліся у пярэстыя шаты польскаго патрыотызму.

Цэлы год такі стан рэчы панаваў у Казані. Паволі уцекачы беларусы, як моладзь так і старшыя паназвычайваліся палякаваць і маскаляваць ды пакепліваць с тых хто іншчэ трымаўся свайго. Здавалося, што усё беларускае задушано гэтта і «прыяцелі» маглі-б спраўляць блюзьнерскія памінкі па папаўшай сюды беларушчыне.

Але так здавалося толькі. «Свой край,—свой звычай», жылі у сэрцах уцекачоў і жыцце сваё азнаймлялі пудой па сабе. А раз жыла нуда па родным краі—жыва была душа беларуская. Патрэбны былі толькі людзі, каторыя-б здалелі паказаць ёй дарогу з туману якім акуталі яе «дабрачынцы» с чужых камітэтаў. I такія людзі ў хутцэ з'явіліся.

V.

Скора Беларусы на столькі паказалі сябе, што аб іх пачалі гаварыць і у Казанскім грамадзянстве і у Казанскай прэссе. Пачатак гэтаму сваёй працай палажыў Я. Станкевіч. Апісаць варункі гэтай працы і усе што рабіў гэты шчыра беларускі патрыота трэба-б было многа мейсца. Змучаны днём на вучэнні з салдатамі, ён мусіў вечарам ісьці за пяць верст у горад і ні завеі з гурбамі сьнегу, ні траскучы мароз ні маглі паўстрымаць яго у лягэры. Ні раз можна было бачыць прапаршчыцкую, усю абвеяную сьнегам, у цяжкіх салдацкіх ботах, пасоўваючуюся позна ноччу у лягэры, хвігуру,—гэта Станкевіч варочаўся з гораду, дзе у якой нібудзь каморацца, у сырым муры і, здаралося, у цемным склепе праводзіў ён вечар, чытаючы нашым селянам — уцекачом кніжкі аб Беларусі, расказуючы аб яе долі, вучачы чытаць старых і малых. Зерняты кіданыя Станкевічам у праўдзівую глебу ні асталіся безплоднымі. Хутка маладыя і старшыя селяне пачалі зьбірацца у гурткі. То там, то сям пачалі адбывацца сходкі. Пачулася патрэба мець сваю кватэру для нацыянальных гурткоў, але беднасьць нашых селян ні пазваляла яе здаволіць.

I аднак, дзякуючы усе тамуж Я. Станкевічу ужо на першым тыдні па Вялікадні у 1917 годзе у новым тэатры беларусы здолелі паставіць сваю вечарыну, якая з аднаго боку павінна была прыцягнуць пад беларускі штандар шырэйшыя колы, а з другого даць матэр'яльныя сродкі для працы. Моральны усьпех вечару быў найпамысльнейшым, матэр'яльна так сама: чыстаго даходу атрымалося 435 рб. с капейкамі.

Далей удалося дастаць дазваленне ад загадчыцы Некрасаўскай біблиотэкі склікаць там сходы, калі чытальня ні будзе занята, без уселякай платы, апрача расходаў на электрычнасьць і за вечары сторажу. Дзякуючы гэтаму нам удалося зрабіць несколькі агульных сходаў. Расійцы бачыўшыя гэтыя сходы ні маглі пасьля надзівіцца. Задзіўляла і будзіла зайздрасьць у іх тая аднальітасьць думак, якая панавала на гэтых сходах. Тутака, праве, нізаметнай рабіласяя рожніца між багатым і бедным, адукаваным і анальфабэтам, усе былі—беларусы каторых туга па радзімым краі сабрала пад адзін дах нараіцца аб супольным дзеле—сваім нішчасьці і нішчасьцях роднай старрны.

Расійцы хутка апамятаваліся ад свайго задзіўлення, калі убачылі да чаго вядуць гэтыя сходы і заварушыліся каля усякіх перашкодаў. Асаблівую увагу сваю зьвярнулі яны на «вінавайцу» прабуджэння беларусаў у Казані, арганізатара і кіраўніка усей культурнай працы Я. Станкевіча. Нават прыгражалі сарваць з яго ахвіцэрскія апалеты і каб ні страх перад ваенным судом,—напэўне зрабілі-б гэто. Аднак нялюбы імі «вінавайца» ні уныраў. Нібавам дзякуючы яго стараннем афіцыяльна адкрыўся у Казані беларускі гурток пад наймекнем «Пралеска» які пад кіраўніцтвам Станкевіча павёў шырокую нацыянальна-культурную працу. На нішчасьце ваенныя павіннасьці Станкевіча, каторы мусіў як ахвіцэр расійскай арміі ісьці на фронт бараніць чужую яму справу, пазбавілі «Пралеску» яе энэргічнаго кіраўніка- арганізацыя пачала хірэць і скарачаць сваю чыннасьць...

В. Грыневіч.

(Працяг будзе).

*) Гл. № 73.

Друкарня Я. А. Грынблята.